АКТУАЛЬНЫЯ ПЫТАННІ ЛІНГВІСТЫКІ, ЛІНГВАСТЫЛІСТЫКІ І ЛІНГВАКУЛЬТУРАЛОГІІ
(матэрыялы пленарнага пасяджэння)

ДАСЛЕДЧЫК РОДНАГА СЛОВА
(да 75-годдзя з дня нараджэння прафесара М. В. Абабуркі)

Шаршнёва Вольга Мікалаеўна
загадчык кафедры агульнага і славянскага мовазнаўства
ўстановы адукацыі "Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя А. А. Куляшова"; кандыдат філалагічных навук, дацэнт
(г. Магілёў, Беларусь)

У развіццё беларускай лінгвістыкі, лінгвастылістыкі і лінгвакультуралогіі вялікі ўклад зрабіў выдатны вучоны, доктар філалагічных навук, прафесар кафедры агульнага і славянскага мовазнаўства Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова – Абабурка Мікалай Васільевіч. Яго філалагічныя даследаванні маюць вялікае навуковае і практычнае значэнне для кожнага, хто займаецца вывучэннем як беларускай літаратурнай мовы, так і мовы беларускай мастацкай літаратуры.

Паводле сцвярджэння М.Н. Крыўко, "мова мастацкай літаратуры – фенаменальная, шматаспектная з'ява" [1, с. 124]. Даследаванне яе ў сучаснай беларускай філалогіі набыло неабходную грунтоўнасць толькі ў канцы XX – пачатку XXI стагоддзя і непасрэдна звязана з імем М.В. Абабуркі. Яго навуковыя працы вылучаюцца прыкметным адыходам ад традыцыйнага вывучэння мовы беларускай мастацкай літаратуры як колькаснай або якаснай характарыстыкі тропаў, стылістычных фігур, індывідуальных асаблівасцей мовы таго ці іншага пісьменніка. Навуковая пазіцыя Мікалая Васільевіча будуецца на канцэпцыі мастацкай літаратуры як сінтэзу розных мастацтваў, тыпаў і спосабаў вобразнага адлюстравання аб'ектыўнай рэчаіснасці. Вучоны лічыць, што мова беларускай мастацкай літаратуры мае сваю сістэму вобразна-выяўленчых сродкаў, якія адлюстроўваюць рэчаіснасць праз вершавана-паэтычнае,

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

апавядальна-празаічнае і дыялагічна-драматургічнае маўленне пісьменнікаў. Станаўленне і развіццё мовы беларускай мастацкай літаратуры М.В. Абабурка бачыць "у мастацкім сінтэзе мовы беларускага фальклору і дыялектнай мовы беларусаў, беларускай вуснай (гутарковай) і пісьмовай (кніжнай) мовы, а таксама ў заканамерным узаемадзеянні (выраўноўванні) сучаснага беларускага агульнанароднага і рэгіянальнага маўлення" [1, с. 125]. М.В. Абабурка дэманструе ў сваіх навуковых працах цікавае даследаванне мовы беларускай мастацкай літаратуры не толькі з пункту погляду яе разнастайных нормаў, але і з пазіцый стылістыкі, лінгвастылістыкі, стылістыкі мастацкай літаратуры, транслінгвістыкі, лінгвакультуралогіі і іншых навуковых дысцыплін, якія толькі пачынаюць развівацца ў беларусістыцы.

Навукова-даследчая спецыялізацыя Абабуркі Мікалая Васільевіча – сучасная беларуская мова (лексікалогія), беларуская дыялекталогія (лексіка), гісторыя беларускай літаратурнай мовы, лінгвістыка тэксту (мова беларускай мастацкай літаратуры), стылістыка мастацкага тэксту, культура беларускай мовы, параўнальная граматыка (беларускай і рускай моў), праблемы перакладу з рускай мовы на беларускую, гісторыя беларускага мовазнаўства, лінгвастылістыка, лінгвакультуралогія і інш. Навукова-дыдактычная спецыялізацыя – сучасная беларуская мова, стылістыка беларускай мовы, культура беларускай мовы, параўнальная граматыка беларускай і рускай моў, лінгвістычны аналіз мастацкага тэксту, лінгвакультуралогія.

Яго першыя дзве кнігі – "Дыялектызмы ў творах беларускіх пісьменнікаў" (1979) і "Стылістычна абмежаваныя словы ў мове беларускай мастацкай літаратуры" (1981) – убачылі свет у выдавецтве "Вышэйшая школа" і сталі падмуркам для напісання доктарскай дысертацыі. Пастаянная, шматгадовая самаадданая праца прынесла плён – у 1996 годзе Мікалай Васільевіч атрымлівае вучонае званне прафесара без абароны доктарскай дысертацыі, а ў 2001 годзе ў Беларускім дзяржаўным універсітэце абараняе доктарскую дысертацыю "Станаўленне і развіццё мовы беларускай мастацкай літаратуры", што акрыліла яго, дало сілы на новыя даследаванні, і (што вельмі важна!) асабліва ў галіне малавывучаных дысцыплін – лінгвастылістыкі, лінгвакультуралогіі, лінгвапаэтыкі.

М.В. Абабурка – аўтар каля 300 навуковых публікацый. Сярод іх манаграфіі: "Развіццё мовы беларускай мастацкай літаратуры" (1987), "Станаўленне і развіццё мовы беларускай мастацкай літаратуры" (2000), "Мова сучаснай беларускай мастацкай літаратуры" (2005), "Беларуская лінгвістычная паэтыка і тэксталогія" (2008), "Паэтыка беларускай літаратуры XVI–XIX стст." (2011), "Сучасны літаратурна-мастацкі расповед" (2012, у сааўтарстве), "Паэтыка беларускай мастацкай літаратуры XX ст." (2014, у сааўтарстве); вучэбныя і вучэбна-метадычныя дапаможнікі: "Параўнальная

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

граматыка беларускай і рускай моў” (1992), “Культура беларускай мовы” (1994), “Тэорыя і практыка перакладу” (2007), “Лінгвістыка тэксту” (2008), “Рознастылёвыя тэксты і іх аналіз” (2010), “Вывучэнне мовы твораў Аркадзя Куляшова” (2014), “Размежаванне часцін мовы і іх граматычных форм” (2015); слоўнікі: “Дыялектызмы ў творах беларускіх савецкіх пісьменнікаў” (1979), “Матэрыялы для абласнога слоўніка Магілёўшчыны” (1981, 2005), “Лінгвастылістычныя і тэксталагічныя тэрміны” (2011), “Слоўнік лінгвастылістычных і тэксталагічных тэрмінаў” (2012) і інш.

Мікалай Васільевіч выконваў заданне “Мова беларускай мастацкай літаратуры” Дзяржаўнай праграмы фундаментальных даследаванняў, “Беларуская мова і літаратура” і заданне “Беларуская лінгвістычная паэтыка і тэксталогія” Дзяржаўнай праграмы фундаментальных даследаванняў “Гісторыя, культура, грамадства, дзяржава”.

За дасягнутыя поспехі ў працоўнай дзейнасці, значны ўклад у навучанне і выхаванне падрастаючага пакалення, высокае педагагічнае майстэрства М.В. Абабурка ўзнагароджаны Граматай Вярхоўнага Савета БССР, Ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Граматамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Ганаровымі граматамі Магілёўскага гарадскога выканаўчага камітэта і інш.

Артыкулы пра М.В. Абабурку размешчаны ў шматлікіх газетах, часопісах, бібліяграфічных і біябібліяграфічных даведніках, энцыклапедыях.

Вялікі аўтарытэт, працаздольнасць, жыццесцвярджальная энергія, можна сказаць, апантанасць Мікалая Васільевіча спрыяюць узнікненню ў студэнтаў і калег цікавасці да філалагічных праблем, інтарэсу да навукова-даследчай дзейнасці. Назвы даследчых тэм кафедры адлюстроўваюць навуковыя інтарэсы Мікалая Васільевіча і пастаянна ўваходзяць у спіс Рэспубліканскіх фундаментальных даследаванняў. Арганізоўваючы працу студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў, прафесар асаблівую ўвагу звяртае на выхаванне ў іх самастойнасці, на фарміраванне ўмення прыводзіць пераканальныя аргументы і адстойваць уласныя пазіцыі.

Улюбёны ў роднае слова, Мікалай Васільевіч заўсёды абараняе права беларускай мовы на прыярытэтную пазіцыю не толькі ў вышэйшай і сярэдняй школе, але і ў грамадстве ў цэлым. Вучоны заўсёды знаходзіцца на пярэднім плане навукі, у самым цэнтры філалагічных дыскусій. Ён успрымае родную мову як крыніцу духоўнасці народа, як гістарычна-культурную з’яву, што звязвае ў адно цэлае стагоддзі і пакаленні.

Няма сумнення ў тым, што для развіцця беларускага мовазнаўства неабходна, каб сённяшнія лінгвісты пры правядзенні ўласных даследаванняў улічвалі шматгадовы вопыт і багатую навуковую спадчыну Абабуркі Мікалая Васільевіча. Яго працы могуць стаць каштоўнай крыніцай вывучэння розных

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

галін беларусістыкі: лексікалогіі, граматыкі, стылістыкі, лінгвастылістыкі, лінгвакультуралогіі, культуры мовы і інш. [2, с. 73–86].

Літаратура

1. Крыўко, М. Н. Даследаванне мовы мастацкай літаратуры / М. Н. Крыўко // Весці Акадэміі навук БССР (Серыя грамадскіх навук), 1988. – № 4. – С. 124–126.
2. Іваноў, Я. Я., Рагаўцоў, В. І. Мовазнаўцы МДУ імя А. А. Куляшова / Я. Я. Іваноў. В. І. Рагаўцоў. Агульнае і славянскае мовазнаўства (1930–2011). – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2012. – 360 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова